ПРЫВІТАЛЬНАЕ СЛОВА
ПРАРЭКТАРА ЎНІВЕРСІТЭТА ПА НАВУКОВАЙ ПРАЦЫ
ВОЛЬГІ УЛАДЗІМІРАЎНЫ ЛУШЧЫНСКАЙ

Шаноўныя ўдзельнікі і госці канферэнцыі! Паважаныя калегі!

Дазвольце ад імя аргкамітэта канферэнцыі і яе старшыні – рэктара ўніверсітэта Н. Я. Лапцевай – сардэчна вітаць вас на ХХІІ міжнароднай навуковай канферэнцыі "Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць", прысвечанай 75-годдзю стварэння Мінскага іняза – цяперашняга МДЛУ. Адразу ж заўважу, што для мяне гэта першая магчымасць адкрыць сустрэчу ў лінгвістычным універсітэце на гістарычную тэматыку і пазнаёміцца з яе ўдзельнікамі.

Арганізацыйна сустрэча праводзіцца ў камбінаваным фармаце (он- і офлайн). Аб сваім удзеле ў ёй заявілі больш за 40 даследчыкаў з Беларусі, Расіі і Францыі. Мы вельмі рады гасцям, сярод якіх французскі даследчык Марыс Панцьё, расійскі гісторык Дзмітрый Папоў і аспірант Арэнбургскага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта Дзінар Хісамутдзінаў. Беларускія гісторыкі прадстаўляюць універсітэты і навукова-даследчыя арганізацыі з Брэста, Магілёва, Мінска і Полацка.

Канферэнцыя арганізавана сумесна з Цэнтрам ваеннай гісторыі Беларусі Інстытута гісторыі НАН Беларусі і адбываецца ў рамках выканання (падпраграма «Гісторыя») Дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў на 2021–2025 гг. «Грамадства і гуманітарная бяспека беларускай дзяржавы» (навуковы кіраўнік – акадэмік НАН Беларусі, доктар гістарычных навук, прафесар А. А. Каваленя). Навукоўцы кафедры гісторыі і сацыяльных навук разам са студэнтамі факультэта нямецкай мовы нашага ўніверсітэта забяспечваюць выкананне тэмы НДР «Палітыка, практыка і наступствы нацысцкага эканамічнага генацыду на акупаванай тэрыторыі Беларусі ў 1941–1944 гг. (на матэрыялах нямецкіх трафейных дакументаў НАРБ)».

Знаёмства з праграмай канферэнцыі дае магчымасць адзначыць таксама той важны факт, што ў фокусе асабістых навуковых пошукаў і калектыўных даследчыцкіх праектаў знаходзіцца праблематыка, датычная гісторыі Беларусі перыяду Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў.

Упэўнена, што новыя ідэі, высновы і ацэнкі, да якіх вы прыйдзеце ў выніку абмеркавання пастаўленых праблемных і дыскусійных пытанняў, не застануцца толькі ў сферы акадэмічнай навукі, але паўплываюць на вырашэнне надзённых выхаваўчых задач у нашым грамадстве, асабліва ў справе патрыятычнага выхавання і прафесійнай падрыхтоўкі студэнцкай моладзі ўніверсітэта ў святле выкладання новай вучэбнай дысцыпліны "Гісторыя беларускай дзяржаўнасці".

Шаноўныя калегі, госці і сябры МДЛУ! Дазвольце аб'явіць адкрытай ХХІІ міжнародную навуковую канферэнцыю "Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць" і пажадаць вам поспехаў.